# СЕКЦИЯ 1

## АКТУАЛЬНЫЕ АСПЕКТЫ ВНЕШНЕЙ ПОЛИТИКИ, ДИПЛОМАТИЧЕСКОЙ И КОНСУЛЬСКОЙ ПРАКТИКИ В СОВРЕМЕННЫХ МЕЖДУНАРОДНЫХ ОТНОШЕНИЯХ

# ДЭБАТЫ ПА ВЕНГЕРСКАМУ КРЫЗІСУ 1956 г. У ААН ПАВОДЛЕ ДЗЁННІКАВЫХ ЗАПІСАЎ ПЯТРО ГЛЕБКІ

***І. М. Аўласенка***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, AvlasenkIM@bsu.by*

Артыкул прысвечаны адлюстраванню дэбатаў па венгерскаму пытанню на 11-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у дзённікавых запісах паэта Пятро Глебкі. Гэтая крыніца, дапаўняючы афіцыйную дакументацыю Міністэрства замежных спраў БССР, дазваляе апісаць атмасферу дыскусій у ААН, стан амерыкана-савецкіх адносін і асаблівасці ўспрыняцця прафесіі дыпламата ў 1950-я гг. Нягледзячы на ўнутрыпалітычную «адлігу» ў СССР і прыкметы «разрадкі» ў савецка-амерыканскіх адносінах у сярэдзіне 1950-х гг., дзённікі Глебкі сведчаць пра захаванне канфрантацыйнага характару міжнародных дэбатаў па венгерскаму крызісу.

***Ключавыя словы:*** пісьменнік; дыпламатыя; Беларуская ССР; Арганізацыя Аб’яднаных Нацый; Генеральная Асамблея; «халодная вайна»; венгерскае паўстанне 1956 г.

# DEBATES ON HUNGARIAN CRISIS OF 1956 AT THE UNITED NATIONS ACCORDING TO THE DIARY RECORDS OF PIATRO HLEBKA

***I. M. Aulasenka***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus*

The article is devoted to the reflection of the debates on the Hungarian crisis of 1956 at the 11th session of the UN General Assembly in the diary records of the poet Piatro Hlebka. This source is complementary to the official documentation of the Ministry of Foreign Affairs of the Byelorussian SSR and describes atmosphere of the debates in the United Nations, the state of Soviet-American relations and the self-perception of Belarusian diplomats in the 1950s. Despite the domestic «thaw» in the USSR and signs of «detente» in Soviet-American relations in the mid-1950s, Hlebka’s diaries proves continuation of the confrontational nature of the international debate on the Hungarian crisis.

***Key words:*** writer; literature; diplomacy; Byelorussian SSR; Organization of the United Nations; General Assembly; Cold War; Hungarian revolution of 1956.

Многія цікавыя старонкі з гісторыі дыпламатыі Беларускай ССР становяцца вядомымі на аснове новых крыніц, здабытых даследчыкамі.

Адной з такіх адметных старонак з'яўляецца пазіцыя Беларускай ССР у дачыненні да венгерскага крызісу 1956 г. Найбольш падрабязны артыкул на гэтую тэму, заснаваны на дакументах з Архіва Міністэрства замежных спраў, успамінах К.В. Кісялёва, быў апублікаваны С.Ф. Свілас у 2011 г. [4] Разам з тым, маюцца і некаторыя іншыя малавядомыя архіўныя крыніцы, якія раней не былі ўведзеныя ў навуковы зварот і якія ўзбагачаюць гістарычны малюнак для чытача і даследчыка. У гэтым шэрагу варта назваць дзённікавыя запісы паэта Пятра Фёдаравіча Глебкі, які ўваходзіў у склад афіцыйнай дэлегацыі Беларускай ССР на 11-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у лістападзе 1956 – лютым 1957 г. Гэты дакумент у выглядзе асобнага блакнота захоўваецца ў фондзе № 24 аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (справа № 904) [2]. Запісы Глебкі, зробленыя падчас назірання за работай Генеральнай Асамблеі ААН і абмеркавання венгерскага пытання, дазваляюць адчуць атмасферу работы міжнароднай арганізацыі, стан амерыкана-савецкіх адносін і ўспрыняцце прафесіі дыпламата ў той час (1950-я гг.).

Восенню 1956 г. антысавецкія настроі ў венгерскім грамадстве прынялі даволі шырокі размах. Выклікана гэта было як незавершанасцю лібералізацыі палітычнай сістэмы краіны, так і адмовай СССР ад планаў вывесці войскі з яе тэрыторыі. У кастрычніку 1956 г. антыўрадавыя і антысавецкія настроі ў венгерскім грамадстве перараслі ў стыхійныя выступленні насельніцтва, а ў хуткім часе – у сутыкненні паўстанцаў з венгерскімі органамі дзяржаўнай бяспекі. Баючыся згубіць Венгрыю са сферы свайго ўплыву, кіраўніцтвам СССР было прынятае рашэнне аб сілавым падаўленні паўстання, што адбылося на пачатку лістапада. Гэта стала магчымым дзякуючы і таму, што амерыканскі бок па прычыне чарговых прэзідэнцкіх выбараў устрымаўся ад адкрытай інтэрвенцыі ў падтрымку антысавецкіх палітычных сіл.

Венгерскія падзеі выклікалі вялікі рэзананс ва ўсёй сусветнай супольнасці. 2-я надзвычайная спецыяльная сесія ГА ААН, што праходзіла з 4 па 10 лістапада 1956 г., была прысвечана менавіта гэтаму пытанню. Падчас яе работы быў прыняты шэраг рэзалюцый, якія заклікалі СССР спыніць умяшанне ва ўнутраныя справы Венгрыі. Пазней на 11-й звычайнай сесіі 12 снежня 1956 г. Генеральная Асамблея абсалютнай большасцю галасоў прыняла рэзалюцыю 1131 (XI), у якой асудзіла «парушэнне Статута урадам Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, якое пазбаўляе Венгрыю яе свабоды і незалежнасці, а венгерскі народ – карыстання сваімі асноўнымі правамі», і заклікала савецкі ўрад «прыняць неадкладна меры да вываду з Венгрыі, пад наглядам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, сваіх узброеных сіл і

дазволіць аднаўленне палітычнай незалежнасці Венгрыі» [3, с. 62]. На аналагічныя праекты рэзалюцый Савета Бяспекі ААН СССР наклаў вета.

Венгерскія падзеі прывялі да росту антысавецкіх настрояў у краінах Еўропы і ЗША. У раней апублікаваным даследаванні прыводзяцца наступныя выпадкі, якія змяшчаліся ў справаздачах беларускіх дыпламатаў: пікетаванне савецкага прадстаўніцтва ў Нью-Ёрке, адмова докераў грузіць і разгружаць багаж савецкіх дыпламатаў, а магазінаў – пастаўляць прадукты прадстаўнічай сталовай. Падчас прыёму, які даваў 7 лістапада 1956 г. пасол СССР у Вашынгтоне, насупраць савецкага пасольства быў запалены вялікі крыж, што асвятліў надпіс наступнага зместу: «Вечная памяць венгерскім рабочым, якія памерлі за свабоду». На даху аднаго з бліжэйшых да будынку ААН дамоў віселі сцягі Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы, Чэхаславакіі, Румыніі, Венгрыі, Албаніі, Балгарыі і вялікі плакат з надпісам «Мы патрабуем свабоды для гэтых краін і правядзення ў іх свабодных выбараў» [4, с. 64].

З-за дзвюх надзвычайных спецыяльных сесій Генеральнай Асамблеі ААН, прысвечаных егіпецкаму і венгерскаму пытанням, 11-я сесія Генеральнай Асамблеі ААН пачалася са спазненнем – 12 лістапада 1956 г. (а не ў трэці аўторак верасня, як звычайна). П.Ф. Глебка разам з іншымі членамі беларускай дэлегацыі накіраваўся ў Нью-Ёрк самалётам з Масквы, з перасадкай у Швецыі. Паэт у запісной кніжцы адзначаў, што дэлегатаў папярэдзілі пра магчымасць правакацый: «У Стакгольме праседзелі ў аэрапорце каля 8 гадзін. Нас нават не выпусцілі на двор з аэравакзала. Прадстаўнікі нашага пасольства ў Стакгольме кажуць, што шмат настроеных супраць савецкіх людзей у сувязі з венгерскімі падзеямі. На вакзале скарбонкі для збору грошай у фонд дапамогі венгерскім "паўстанцам". У адной з іх даволі салідная куча грошай» [2, арк. 113–114].

Сітуацыя ў Венгрыі значна павысіла градус накала абмеркаванняў на сесіі ГА ААН. Гэта прасочваецца і па запісах П.Ф. Глебкі, у якіх падрабязна і эмацыянальна занатаваныя асобныя спрэчкі, што разгарнуліся пры абмеркаванні праекта рэзалюцыі па гэтым пытанні 4 снежня 1956 г. У прыватнасці, прадстаўнік Злучаных Штатаў назваў падзеі ў Венгрыі «крывавай трагедыяй», «горшым паказчыкам рэжымаў рускага царызма, Леніна, Сталіна, Хрушчова» [2, арк. 101]. Намеснік міністра замежных спраў СССР В.В. Кузняцоў у адказ выказаў «пратэст супраць абразлівых выразаў амерыканца супраць дзеячаў Савецкага Саюза» [2, арк. 102]. Накал дыскусій быў настолькі вялікі, што П.Ф. Глебка ў сваіх запісах адзначаў, як нерваваўся савецкі прадстаўнік: «…хвалюецца, голас перасякаецца, ён раз, другі раз п'е ваду, горла

перасохла, пяршыць. Патроху голас мацнее, перамагае прамоўца хваляванне. Амерыканцы хвалююцца, перашэптваюцца, кудысьці часта выходзяць» [2, арк. 100]. Паводле сведчання паэта, часам выступленне савецкага прадстаўніка перарывалася гучнымі крыкамі незадаволеных членаў іншых дэлегацый: «Слова СССР (у публіцы – о-о-о! (шум, выкрыкі))» [2, арк. 118]. Праз некалькі дзён Глебка стаў сведкам чарговых спрэчак на сесіі Генеральнай Асамблеі. «Ізноў пачалося наступленне чорных сіл на Венгрыю. Усё тыя ж знаёмыя твары: перуанец (Белаундэ), італьянец і інш. Аднак у выступленнях заўважаецца новы манеўр, новы ход: і перуанец, і італьянец вельмі ўжо "хварэюць" за маральны ўрон, нанесены СССР дзеяннямі савецкіх войск у Венгрыі. Але, плачучы, яны ўгаварваюць асамблею, што быццам бы Савецкаму Саюзу нельга верыць і ў справе раззбраення... Вось, аказваецца, куды цэляць "перуанцы"! Вядзецца падтрыхтоўка пазіцыі, з якой, напэўна, будуць адмаўляць савецкія прапановы аб раззбраенні» [2, арк. 115]. Не раз з боку замежных дыпламатаў гучалі прапановы прыпыніць членства Венгрыі і нават Савецкага Саюза ў ААН.

Прадстаўнікі дэлегацыі Беларускай ССР адчувалі сябе ў такой атмасферы вельмі няёмка. П.Ф. Глебка таксама балюча ўспрымаў адкрытую антысавецкую крытыку з боку дэлегатаў іншых краін. Вось як ён апісваў выступленне прадстаўніка франкісцкай Іспаніі ў сваім блакноце: «І пайшлі паклёпы і бруд, што быццам бы венгерскі прадстаўнік – рускі чыноўнік і інш. Прапанаваў прыняць рэзалюцыю, і ізноў пачаў паклёпы, аж лопаючыся (нават амерыканцы сядзелі і ўсміхаліся, а другія – крывіліся, трэція – апусцілі ўдол вочы)» [2, арк. 98–99]. Некаторыя прыватныя ацэнкі выступленняў замежных дэлегатаў, адлюстраваныя ў запісах паэта, таксама насілі рэзкі характар. Паказальна, што калі чарга выступаць дайшла да дзяржаўнага сакратара ЗША Джона Фостэра Далеса, то Пятро Глебка нават не стаў занатоўваць асноўныя тэзісы яго прамовы, а проста запісаў: «Сабака!!!» [2, арк. 88].

Незадавальненне беларускай савецкай дэлегацыі (і П.Ф. Глебкі ў прыватнасці) выклікала пазіцыя па венгерскім і егіпецкім пытаннях Генеральнага сакратара ААН Дага Яльмара Хамаршэльда. Вяртаючыся пасля аднаго з начных пасяджэнняў Генеральнай Асамблеі, Глебка склаў наступную эпіграму на шведскага дыпламата:

Я доўга вырашыць не мог –
Ні то ён Даг, ні то ён дог,
А глянуў, як ён службу нёс,
І тут жа ўпэўніўся, што пёс [2, арк. 120].

Вострыя эпітэты і эпіграмы, якія маюцца ў архіўных дакументах паэта, тлумачацца атмасферай «халоднай вайны», якая не знікла нават з пачаткам «адлігі» ва ўнутрыпалітычным жыцці СССР і першымі прыкметамі «разрадкі» ў савецка-амерыканскіх адносінах у сярэдзіне 1950-х гг. Маштабная канфрантацыя ў палітычнай, эканамічнай, ваеннай і ідэалагічнай сферы паміж Злучанымі Штатамі і Савецкім Саюзам пасля заканчэння Другой сусветнай вайны, наклала адбітак на ўспрыняцце самой прафесіі дыпламата. Як у дароўным надпісе, што паэт пакінуў на зборніку сваіх вершаў міністру замежных спраў БССР К.В. Кісялёву [1, с. 268–269, 311], так і ў апублікаваным пазней вершы «Дыпламаты» Глебка параўноўвае дыпламатычную службу з ваеннай, спадабляе працу дыпламата місіі салдата, «што верна бароніць Радзіму сваю»:

А наш дыпламат – гэта той же салдат…
А можа быць – больш, – палкаводзец.
І добрых надзей на яго у нас шмат.
У нас – гэта значыць ў народзе.
<…>
Але ў яго сэрца з вялікіх трывог
Заходзіцца часта, грукоча заўзята.
І недзе на нейкай з сусветных дарог
Яно разарвецца, як тая граната.

Хвала табе, сэрца, што ноччу і днём
Ты б'ешся за долю народа няспынна
І вечна жывым, неўміручым агнём
Бароніш ад ворагаў шчасце краіны [1, с. 269].

Такое параўнанне ўзнікла невыпадкова: яшчэ свежымі ў памяці былі баі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, а пачатак канфрантацыі са Злучанымі Штатамі адзначаўся ўкараненнем ваеннай рыторыкі ў афіцыйны дыскурс улады, у тым ліку канцэпцыі супрацьстання «двух лагераў». Гэта сведчыць пра тое, што працягвала дамінаваць прадстаўленне пра дыпламатычную працу, што сфарміравалася яшчэ на пачатку «халоднай вайны», у сталінскі перыяд кіравання. Менавіта таму дыпламат таксама ўспрымаўся як воін, які адстойваў гонар дзяржавы, толькі іншымі метадамі і сродкамі.

Такім чынам, дзённікавыя запісы П.Ф. Глебкі паказваюць, што венгерскі крызіс 1956 г. стаў сур'ёзным выпрабаваннем для савецкай дэлегацыі ў ААН, якая вымушана была вытрымаць істотны напор крытыкі з боку міжнароднай супольнасці. Занатаваныя думкі паэта

сведчаць пра тое, што такая крытыка членамі беларускай дэлегацыі ўспрымалася з абурэннем, як несправядлівая. Дзённікавыя запісы Пятро Глебкі, прысвечаныя і венгерскаму крызісу, і іншым падзеям 1955–1957 гг. служаць доказам таго, што, нягледзячы на ўнутрыпалітычную «адлігу» ў СССР і першыя крокі па зніжэнні напружанасці, градус канфрантацыі ў амерыкана-савецкіх адносінах працягваў заставацца высокім.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Глебка, П.Ф. Збор твораў: у 2 т. Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1958. Т. 1. Вершы. 497, [1] с., [1] л. партр.
2. Записные книжки Петра Глебки с записями, сделанными во время поездки на сессию Генеральной Ассамблеи ООН (записи дневникового характера, заметки, стихотворения и др.). 1956–1957 гг. // ЦНБ НАН Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 904.
3. Резолюция Генеральной Ассамблеи ООН 1131 (XI) «Положение в Венгрии» (принята 12 декабря 1956 года) [Электронны рэсурс] // Организация Объединённых Наций: [сайт]. [2020] URL : https://undocs.org/ru/A/RES/1283%28XIII%29. (дата звароту: 28.11.2020).
4. Свилас С.Ф. «Венгерский октябрь» 1956 г. и дипломатия Белорусской ССР // Журнал международного права и международных отношений. 2011. № 1.

## КНР – РФ: ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ В РАМКАХ МЕЖДУНАРОДНЫХ ОРГАНИЗАЦИЙ В 2013-2019 гг.

***Ван Фа***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 2200030, г. Минск, Беларусь, 1394903742@qq.com*

В статье описываются цели и общие приоритеты участия Китайской Народной Республики и Российской Федерации в таких организациях, как ООН и ШОС. Автором обосновывается то, что китайско-российские отношения в рамках деятельности международных организаций представляют собой «стратегическое партнерство», то есть две страны рассматривают себя как партнеров по стратегическим вопросам, связанным с глобальным управлением, структурой мировой геополитики и безопасности. Многие из них имеют важное политическое значение для обеих стран, определяющее векторы их внешней политики. В частности, в Совете Безопасности ООН КНР и РФ проводят совместную политику, направленную на отстаивание своих национальных интересов, что объясняется совместными использованием права вето в 2013-2019 гг. по резолюциям в отношении Сирии, Ирана, Украины и Венесуэлы. В рамках взаимодействия в ШОС усилия обеих стран направлены на необходимость